*«Ёсць чары ў забытым,*
*старадаўным;*
*Прыемна нам сталеццяў*
*пыл страхнуць*
*І жыць мінулым – гэткім мудрым,*
*слаўным, –*
*Быццё дзядоў у смутку*
*ўспамянуць».*

**(«Тэрцыны», Максім Багдановіч)**

# Магдаленаўскі баль-рэканструкцыя

Уздзеншчына – край таленавітых і ініцыятыўных людзей, пісьменнікаў, мастакоў, краязнаўцаў... Адной са знакамітых асобаў з'яўляецца княгіня, мецэнатка і асветніца Марыя Магдалена Радзівіл. У ліпені споўнілася 155 гадоў з дня яе нараджэння.



У наш час так здараецца, што многія не ведаюць гісторыю свайго краю, нават сваё сямейнае дрэва. Забываюць наведваць бацькоўскі дом, родныя мясціны, не шануюць помнікі архітэктуры, памяць аб таленавітых людзях...

Сама Магдалена Радзівіл дзякуючы бацьку вельмі любіла сваю Радзіму: фінансавала дзіцячыя прытулкі, бальніцы, выдавецтвы, таварыствы, кнігі класікаў беларускай літаратуры, першыя беларускія газеты, адкрывала беларускія школы, будавала чыгункі. З гербам яе роду «Лебедзь» выдадзены першыя кнігі беларускіх пісьменнікаў: Максіма Багдановіча, Максіма Гарэцкага, Ядвігіна Ш., Якуба Коласа...

Напярэдадні аб'яўленага Магдаленаўскага балю адбылася экскурсія ў яе былы маёнтак. Менавіта нам шчасціць бачыць яго амаль такім, які ён быў пры жыцці Магдалены. Але будынкам не перашкодзіла б рэстаўрацыя!

Цяпер тут, у пасёлку Першамайск (сучасная назва. – **«КГ»**), размяшчаецца дзяржаўны сельскагаспадарчы ліцэй, і пра былую раскошу нагадваюць толькі старыя муры гаспадарчых пабудоваў, напаўразбураны кальвінскі збор ды прыгожая альтанка ў парку.

Настаўнік Павел Апановіч, нястомны краязнаўца-гісторык, правёў слухачоў па былым маёнтку, расказаў гісторыю кожнага будынка. Удзельнікі экскурсіі, а гэта былі ў асноўным маладыя людзі; паўдзельнічалі ў касцюмаванай фотасесіі.

На былых палетках маёнтка Кухцічы, дзе гаспадарылі калісьці Марыя Магдалена і Мікалай Радзівілы, цяпер працуюць хлебаробы ЗАТ «Новае жыццё» і «Агра-Кухцічы». 19 жніўня, на Яблычны Спас, з акцыяй удзячнасці «Там, дзе ступала нага Магдалены» да іх завіталі супрацоўнікі цэнтральнай раённай бібліятэкі імя П. Труса, сябры літаратурна-творчага аб'яднання «Вясёлка» Валерыя Сарока і Аляксей Буры, бібліятэкарка Сямёнавіцкай сельскай бібліятэкі Марына Кароль.

Першым на просьбу спыніцца адрэагаваў трактарыст Уладзімір Жук. Мы расказалі яму пра нашую акцыю, падзякавалі за працу, спыталі дазволу разам сфатаграфавацца. Вядома ж, мы адрывалі людзей ад справы, але ніводзін з тых, каго мы сустрэлі ў гэты дзень (Аляксандр Клімовіч, Леанід Кісель, Уладзімір Карачун), не адмовіўся пагутарыць з намі. Лера і Лёша ад імя Магдалены ўручалі механізатарам сок, ваду, цукеркі і яблыкі, мы праводзілі кароткую фотасесію, і кожны кіраваўся па сваіх справах.

...Да пасёлка Першамайск, дзе раней быў маёнтак Кухцічы, мы ехалі па старым тракце, па якім калісьці Магдалена і Мікалай Радзівілы ездзілі ў Нясвіж. Нават крыху сімвалічным нам здалося тое, што на гэтай старой дарозе мы ўбачылі яблыньку, якая аж да зямлі схіліла галінкі з прыгожымі і смачнымі пладамі.

Па ініцыятыве літаратурна-творчага аб'яднання «Вясёлка», пры падтрымцы цэнтральнай раённай бібліятэкі імя П. Труса і райкама БРСМ 20 жніўня ў гонар Магдалены Радзівіл прайшоў баль-рэканструкцыя пачатку XX стагоддзя.

Госці і жыхары горада мелі магчымасць апынуцца на балі ў Магдалены, даведацца пра яе лёс, аб якім расказалі вядучыя свята Вольга Віяленцій і Надзея Скараход, станцаваць грандмарш, вальсы, па-дэ-труа, наведаць мастацкі салон, выставу мастакоў Андрэя Лычкоўскага і Яўгена Шунейкі, на карцінах якіх былі адлюстраваны ўздзенскія краявіды. Ахвочыя замовілі свой партрэт у майстра Шунейкі, сфатаграфаваліся з «родзічамі, сябрамі і пісьменнікамі», якім Магдалена фінансавала выданне паэтычных зборнікаў. Іх увасаблялі сябры літаратурна-творчага аб'яднання «Вясёлка» Ксенія Андросік, Валерыя Сарока, Ягор Лапцэвіч, Ларыса Міхайлоўская, Ксенія Мельнікава, Артур Казаткоў, Аляксей Буры, Марыя Паўловіч, Уладзіслаў Лычкоўскі, Яніна і Аліна Шавель, Ірына Бельская, Валерыя Рудакоўская, Павел Апановіч, Надзея Скараход, Ілья Сяменаў, Марыя Булаш, Усціння Корзун, Аліна Свідзер, Мікіта Азарко. Фотакопію партрэта Магдалены мастака Алеся Цвыркунова на баль для літаратурнага салона прадставіў жыхар горада, мецэнат цыкла краязнаўчых календароў пра Уздзеншчыну Аляксандр Нікітка. Зацікаўленасць наведнікаў выклікала і выстава рарытэтных кніг з прыватнай калекцыі гісторыка П. Апановіча. Кожны змог разгарнуць і пачытаць фаліянты часоў Магдалены Радзівіл. Словы ўдзячнасці зямлячцы гучалі і ад мясцовых байкераў, якія завіталі падтрымаць удзельнікаў балю.

Пад час свята ў межах кампаніі «Будзьма беларусамі!» выступіла таленавітая спявачка Таццяна Матафонава. Пераможцаў віктарыны для знаўцаў біяграфіі Магдалены Радзівіл, якую правяла Святлана Чакушка, чакалі цікавыя падарункі ад кампаніі «Будзьма беларусамі!»

Традыцыйна на мерапрыемствах, якія ладзяцца з дапамогай Уздзенскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя П. Труса, праводзіцца «літаратурная прышчэпка». Вось і на балі кожны мог паўдзельнічаць у ёй і атрымаць за гэта салодкі падарунак. Ахвочыя змаглі «прышчапіцца» вершамі беларускіх паэтаў, зборнікі якіх фінансавала наша знакамітая зямлячка.

Дзякуем усім, хто паўдзельчаў і падтрымаў наш гістарычны праект. Калі мы будзем памятаць пра нашых землякоў, калісьці будуць памятаць і пра нас!..

Дзякуем табе, Марыя Магдалена Радзівіл, за любоў да беларускага слова і роднай зямлі!

***Валерыя РУДАКОЎСКАЯ,***
***студэнтка Белдзяржуніверсітэта культуры і мастацтваў,***
***Ірына БЕЛЬСКАЯ, бібліятэкар Уздзенскай СШ № 1 імя А.С. Пушкіна***



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ